3. Вортман, Р. «Официальная народность» и национальный миф российской монархии XIX века / Р. Вортман // Культурные практики в идеологической перспективе: Россия XVIII–начало XX в. / Под ред. Н. Охотина. М.: ОГИ, 1999 – вып. 3 – С. 233–244.

4. Гурин, А.В поисках утраченного / А. Гурин // СБ Беларусь сегодня – 2006. – 14 янв. – С. 27.

5. Козлов, Г. Архитектор Константин Тон / Г. Козлов // Немецкая волна [Электронный ресурс] – 2003. Режим доступа: http://dw-club.org/dw/article/0,2144,831153,00.html – Дата доступа 16.07.2016.

6. Лабынцев, Ю., Щавинская, Л. Александро – Невский собор в Варшаве. / Ю. Лабынцев, Л. Щавинская Л. Александро // Православное обозрение "Радонеж" – 1999 – 30 апр. – № 9–10 – С. 23–27.

7. Решетников, С.В., Старовойтова, Л.В. Предыстория возникновения термина «идеология» / С.В. Решетников, Л.В. Старовойтова // Основы идеологии белорусского государства: Учебное пособие для вузов / Под общ. ред. С.Н. Князева, С.В. Решетникова. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – Гл. 1. – С. 3–14.

8. Смалюк, А. Исторический центр Минска. / А. Смалюк // Livejournal [Электронный ресурс] – 2006. Режим доступа: http://antonsm.livejournal.com/2101.html – Дата доступа 16.07.2016.

9. Ярашэвіч, А. Пінскі кляштар бернардзінцаў / А. Ярашэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш – Мінск.: БелЭн, 1999. – Т. 5. М – Пуд. – С. 501–592.

10. Чантурыя, В.А. История архитектуры Белоруссии / В.А. Чантурыя – Минск: Вышэйшая школа, 1977. – 324 с.

11. Чантурыя В.А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В.А. Чантурыя – Минск: Полымя, 1986. – 236 с.

## Кальвінізм у гісторыі і культуры Беларусі

Багдановіч А. Г. г. Мінск, БНТУ

У сярэдзіне XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім пачалося імклівае распаўсюджванне ідэй заходнееўрапейскага пратэстантызму. Рэфармацыя на Беларусі не была простым

водгукам заходняй, а выступала як нацыянальная гістарычная з’ява; яе ідэолагі ў сваёй большасці былі самастойнымі мысліцелямі.

Адной з асноўных рэфармацыйных плыняў у ВКЛ быў кальвінізм. Асновы веравучэння і культу кальвінізму сфармуляваў французскі тэолаг Жан Кальвін (1509–1564). Як рэлігійная сістэма кальвінізм склаўся ў Жэневе (Швейцарыя), адкуль распаўсюджваўся по Еўропе.

У ВКЛ галоўную сацыяльную базу кальвінізму складалі магнаты, а таксама шляхта і частка гараджан. Апраўданне Кальвінам барацьбы супраць тырана, які парушае запаведзі Бога, адпавядала традыцыйным каштоўнасцям вольнасці шляхты, давала падставу для супраціўлення цэнтральнай уладзе, а вялікі ўплыў патронаў на кіраванне рэфармацкай царквой дазваляў ім кантраляваць рэлігійнае жыццё падданых. Дзейнічаў прынцып “Чыя ўлада, таго і вера”.

Пачатак кальвінізму на Беларусі паклаў віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Чорны. Найбуйнейшы магнат, перш чым уступіць на шлях Рэфармацыі, праз выданне ў 1547 г. сваёй стрыечнай сястры Барбары за Жыгімонта II Аўгуста заняў ключавыя пасады ў дзяржаве: стаў віленскім і трокскім ваяводамі, канцлерам ВКЛ, здабыў для свайго рода княжаскі тытул. Акрамя таго ён атрымаў ад манарха ўзнагароды за службу, шматлікія землі і маёнткі. Вялікая ўлада дазволіла яму пры рэформе царквы не лічыцца з аўтарытэтамі. У пачатку 50-х гг. XVI ст. Мікалай Радзівіл Чорны схіліўся да Рэфармацыі і выступіў супраць каталіцкай царквы. Наведаўшы Германію і ўласнымі вачыма паглядзеўшы на новую царкву, звярнуўшыся на радзіму ён прыступіў да царкоўных пераўтварэнняў.

Тагачаснаму некаранаванаму ўладару Вялікага Княства Літоўскага пратэстанства ўяўлялася адным з дзейсных спосабаў збаўлення ад згубнага для суверэнітэту ВКЛ уплыву суседзяў. Канцлер хацеў з дапамогай новай веры ідэалагічна і духоўна абараніць ВКЛ і ад Польшчы, і ад Масковіі.

Пад асабістым заступніцтвам М. Радзівіла ў сярэдзіне XVI ст. былі арганізаваны кальвініcцкія зборы ў Нясвіжы. Клецку, Іўі, Оршы і інш. У 1557 г. у Вільні пад яго старшынствам адбыўся першы ўстаноўчы з’езд літоўскіх пратэстантаў.

Радзівіл Чорны уступіў у перапіску з Ж. Кальвінам, М. Лютэрам і іншымі прадстаўнікамі рэфармацыйнага руху. Дзеля папулярызацыі кальвіністкіх ідэй на тэрыторыі дзяржавы, Радзівіл Чорны заснаваў пры Берасцейскім зборы першую на тэрыторыі Беларусі друкарню, у якой друкавалася не толькі рэлігійная, але і свецкая літаратура. У 1563 г. на сродкі Радзівіла быў выдадзены польскі пераклад поўнага зводу Бібліі, найбуйнейшага па аб'ёме і аднаго з лепшых па мастацкіх і паліграфічных якасцях рэнесансавага выдання. У гісторыю беларускага кнігавыдавецтва яна ўвайшла пад назвай "Брэсцкая, ці Радзівілаўская біблія".

У другой палове XVI–пачатку XVII стагоддзяў у многіх гарадах і мястэчках ВКЛ узніклі кальвіністкія асяродкі: у Менску, Полацку, Віцебску, Беліцы, Заслаўі, Глыбокім, Жупранах, Івянцы, Койданаве, Капылі, Смаргоні, Слуцку, Шклове і інш. Вакол іх групуюцца выдатныя вучоныя, прапаведнікі, пісьменнікі, кнігавыдаўцы.

У 1550–70-я гг. кальвінізм прынялі Кішкі, Валовічы, Дарагастайскія, Хадкевічы, Тышкевічы і іншыя магнацкія роды. У 1563 г. кальвіністкая шляхта была ўраўнавана ў правах з каталіцкай і праваслаўнай. Большасць збораў знаходзілася ва ўладаннях феадалаў і ўтрымлівалася за іх кошт. У буйных гандлёвых і рамесных цэнтрах (Вільні, Віцебск, Мінск, Полацк і інш.) значную ролю ў кіраванні суполак адыгравалі гараджане. Пры зборах існавалі шпіталі, школы, друкарні, дзе выдавалася літаратура на польскай і беларускай мовах.

Большая частка кальвіністкіх збораў размяшчалася ў заходніх і цэнтральных паветах, дзе існавалі буйныя прыватнаўласніцкія ўладанні. Гэтаму спрыяў і разнародны этнарэлігійны склад насельніцтва рэгіёна ў параўнанні з усходняй часткай Беларусі, дзе пераважвала праваслаўнае насельніцтва.

У сярэдзіне 1550-х гг. у Вільні Мікалаем Радзівілам Чорным была заснавана кальвіністкая школа – сярэдняя навучальная ўстанова. Віленская школа складалася з 5 класаў і давала адукацыю на ўзроўні гімназіі. Узначальвалася рэктарам, якога прызначаў кальвіністкі сінод Літоўскай правінцыі. Акрамя асноў кальвінізму вывучаліся лацінская і старажытна-грэчаская мовы, рыторыка, паэтыка, матэматыка, гісторыя, юрыспрудэнцыя. У 1588 г. віленскі кальвіністкі сінод прыняў рашэнне аб ператварэнні школы ў акадэмію. Аднак гэта не было ажыццёўлена з-за супраціўлення

караля і езуітаў. У канцы XVI–пачатку XVII стст. віленская кальвінісцкая школа лічылася лепшай сярод пратэстанцкіх навучальных установ у ВКЛ. Тут вучыліся дзеці кальвінісцкай шляхты і гараджан з Беларусі, Літвы, Курляндыі, Прусіі. Выхаванцам школы быў І.В. Руцкі (пазней уніяцкі мітрапаліт). У 1630-я гг. з-за рэлігійных ганенняў і пагаршэння матэрыяльнага забеспячэння школа прыйшла ў заняпад.

У 1570-х–пачатку XVII ст. кальвінісцкія школы існавалі таксама ў Віцебску, Глыбокім, Заслаўі, Магілёве, Навагрудку, Оршы, Свіслачы, Смаргоні, шклове і інш. Мелі розны ўзровень: ад ніжэйшых (пачатковыя, 6 гадоў навучання) да 5-класных вучылішчаў (10 гадоў навучання), якія давалі адукацыю, дастатковую для паступлення ва універсітэт. Асаблівая ўвага ў кальвінісцкіх школах аддавалася рэлігійнаму навучаенню і выхаванню, фізічнаму выхаванню; акрамя багаслоўя вывучаліся мовы, рыторыка, гісторыя, матэматыка, логіка і інш. Выкарыстоўваліся элементы класна-урочнай сістэмы, гуманістычныя падыходы ў арганізацыі навучання. У навучэнцаў фарміравалася крытычнае мысленне [1, с. 141].

У 1560-я гг. склалася арганізацыйная структура кальвінісцкай царквы. Кальвіністы ВКЛ утварылі асобную Літоўскую правінцыю, якая падзялялася на 6 дыстрыктаў: Брэсцкі (Падляшскі), Віленскі, Навагрудскі, Жмудскі, Завілейскі, Рускі (пазней Беларускі з цэнтрам у Мінску). Вышэйшым органам з’яўляліся сіноды (правінцыяльныя, а ў дыстрыктах партыкулярныя), у іх рабоце ўдзельнічалі духоўныя і свецкія асобы. Паміж сінодамі кіраўніцтва ажыццяўляў суперінтэндант. Цэнтр правінцыі знаходзіўся ў Вільні. Дыстрыкты кіраваліся сіньёрамі. На чале асобных збораў стаяла духавенства (пастары, прапаведнікі або міністры) і выбраныя са свецкіх асоб старэйшыны (сіньёры, прэсвітары), важную ролю адыгравалі патроны суполак.

Перыядычна склікаліся сіноды дыстрыктаў, якія называліся партыкулярнымі. Арганізуючым цэнтрам быў агульнадзяржаўны сінод, які штогод збіраўся ў Вільне і меў назву правінцыяльнага. Сумесныя польска-літоўскія сіноды называліся генеральнымі. Кожны сінод вырашаў агульныя справы рэлігійных абшчын, прызначаў іх кіраўнікоў – міністраў і сеньёраў, разглядаў маёмасныя, прававыя і іншыя рэлігійная праблемы. Кожны сінод

меў сваю агульную касу (каленту), якая складалася са сродкаў пратэстанцкай шляхты і гарадскіх мяшчан. Грошы выкарыстоўваліся для матэрыяльнай падтрымкі абшчын (збораў), састарэлых, удоў, вучняў і хворых. У набажэнстве і справаводстве кальвінісцкая царква выкарыстоўвала польскую мову.

Да 60-х гг. XVI ст. у кальвінізм перайшла большасць беларускіх магнатаў і значная частка шляхты. З 600 праваслаўных шляхецкіх фамілій Навагрудскага ваяводства вернасці сваей рэлігіі захавалі толькі 16. Папскі нунцый Камедоні ў сакавіку 1564 г. паведамляў у Рым: “Ерытычнае нахабства і свавольства бязмежныя”, “колькасць ерэтыкоў страшэнна ўзрастае”, “амаль штодзень апаганьваецца які-небудзь касцёл”, яшчэ нейкі час – і ўжо нешматлікая каталіцкая царква застанецца без паствы [3, с. 401–402].

Пад сцягам кальвінізму спачатку аб’ядналіся ўсе слаі грамадства, якія прымалі ўдзел у Рэфармацыі. Да 1562 г. яшчэ не было рэзкіх разыходжванняў паміж рознымі сацыяльнымі групоўкамі. Між тым магнаты і шляхта, якія дамагліся сваіх мэт, рабіліся ўсё больш абыякавымі да Рэфармацыі.

У 60-я гады XVI ст. на Беларусі, у Літве і на Украіне з кальвінізму вылучыўся больш радыкальны напрамак – антытрынітарскі, ці, як яго называлі інакш, – арыянскі. Сваімі каранямі ён уваходзіў у IV ст. і атрымаў назву ад імя александрыйскага епіскапа Арыя, які выступіў супраць боскай сутнасці Ісуса Хрыста і Святой Тройцы. У 40-я гг. XVI ст. большасць італьянскіх антытрынітарыяў уцякае ад інквізіцыі ў Швейцарыю, а затым у Польшчу і на Беларусь.

Беларускі антытрынітарызм імкнуўся да радыкальных сацыяльна-палітычных змяненняў: ліквідацыі паншчыны, прыватнай уласнасці, феадальных прывілеяў; выступаў супраць свецкай улады, войнаў, сацыяльнай, нацыянальнай і рэлігійнай няроўнасці; выношваў утапічныя планы перабудовы грамадства. Антытрынітарыі адмаўлялі антычную філасофію, схаластыку, былі стойкімі прыхільнікамі роўнасці, справядлівасці, братэрства, чалавекалюбства.

Найбольш выдатным прадстаўніком ў беларуска-літоўскім антытрынітарызме быў Сымон Будны, пісьменнік, асветнік, гуманіст. Вядомы беларускі мысліцель-гуманіст эпохі Адраджэння, Сымон Будны распачаў сваю асветніцкую дзейнасць у ВКЛ

у 1558 г., калі прыехаў у сталіцу Вялікага Княства Літоўскага – Вільню, дзе заняў пасаду катэхізіста з абавязкам выкладаць асновы кальвіністкага вучэння дзецям і дарослым. У 1560 г. Сымон Будны быў прызначаны прапаведнікам у Клецк. Сумесна з нясвіжскім намеснікам Мацеем Кавячынскім і яго братамі, а таксама з кальвіністкім міністрам (прапаведнікам) Лаўрэнціем Крышкоўскім Будны заснаваў у Нясвіжы друкарню. Па загадзе Астафія Валовіча, будучага канцлера ВКЛ, у Нясвіж былі перавезены шрыфты Ф. Скарыны. У 1562 г. у нясвіжскай друкарні выйшла першая кніга – "Катэхізіс", галоўная роля ў напісанні якой належала С. Буднаму. У гэтым жа годзе ў нясвіжскай друкарні выйшаў другі беларускі твор – "Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам" [2, с. 52].

Незадаволены памяркоўнасцю кальвінізму, у пачатку 1560-х гг. Сымон Будны выказвае сумненні наконт трактоўкі асноўных палажэнняў хрысціянскай дагматыкі – дагмата Троіцы і прыроды Хрыста і пераходзіць на больш радыкальныя пазіцыі антынітарызму. Утапічнасць наіўна-сацыяльных летуценняў, унутраная супярэчнасць, процідзеянне феадалаў, каталіцкая рэакцыя прывялі да заняпаду антытрынітарызму.

У перыяд Контрэфармацыі большасць кальвіністаў перайшла ў каталіцтва. Тыя, што засталіся, абмяжоўваліся ў правах. Для абароны сваіх інтарэсаў кальвіністкая шляхта ўтварыла канфедэрацыю з праваслаўнымі (1599 г.). Пасля далучэння зямель Беларусі да Расіі рэфармацкая царква страціла аўтаномію ад дзяржавы. Кальвіністкія зборы падпарадкоўваліся кансістору, які прызначаўся на сваю пасаду царскімі ўладамі. У пачатку XX ст. на Беларусі заставаліся адзінкавыя кальвіністкія суполкі, частка іх праіснавала да пачатку Другой сусветнай вайны. У верасні 1992 г. у Мінску зарэгістравана кальвіністкая абшчына – хрысціянская рэлігійная кангрэгацыя (Беларускі евангелічны рэфармацкі збор).

Такім чынам, кальвінізм, які найбольш адпавядаў традыцыйным каштоўнасцям вольнасці магнатаў і шляхты ВКЛ, аказаў значны ўплыў на культурныя працэсы на землях Беларусі ў час Рэфармацыі; садзейнічаў пашырэнню кнігадрукавання, развіццю літаратуры, мастацтва, асветніцкай дзейнасці. У кальвіністкай этыцы ўвасобіліся каштоўнасці новага часу: прагматызм, працавітасць, жыццёвая актыўнасць.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Рэлігія і царква на Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 5. / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – 368 с.
2. Мысліцелі і асветнікі Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш – Мінск.: БелЭн, 1999. – Т. 5. / Б.І. Сачанка(гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1995. – 671 с.
3. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый. / І.П. Крэнь. І.І. Коўкель, С.В. Марозава і інш. – Мінск: РІВШ БДУ, 2000. – 656 с.
4. Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI–начало XVII в.). – Мінск: Наука и техника, 1970.

## Уплыў краевай ідэалогіі на пошук форм нацыянальнага самавызначэння на беларуска-літоўскіх землях у пачатку XX ст.

Багалейша С. В. г. Мінск, БНТУ

На пачатку XX ст. назіраецца значнае ажыўленне беларускага і літоўскага нацыянальных рухаў. Народы, прыгнечаныя ў межах Расійскай імперыі, імкнуцца вызначыць свае адносіны да перспектыў развіцця ўласнай дзяржаўнасці і знайсці дзейсныя формы рэалізацыі гэтай ідэі. Важным этапам у развіцці беларускага нацыянальнага руху і змяненні яго ідэалогіі стала рэвалюцыя 1905–1907 гг. Пад яе ўплывам ён пачаў ператварацца ў істотны фактар грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Беларуска-Літоўскага краю. Сфарміравалася ідэя палітычнай нацыі, якая была непарыўна звязана з краёвай ідэалогіяй. З'яўленне краёвасці ў грамадска-палітычным жыцці было выклікана абвастрэннем этнічных і сацыяльных адносін у Расійскай імперыі. Выпрацоўка асноўных палажэнняў краёвай ідэалогіі закончылася вясной 1906 г. Але, побач з афармленнем краёвай ідэалогіі, ўзмацнялася пачуццё прыналежнасці да пэўнага этнасу.